традиций любовь к своему Отечеству с одновременной привязкой к ценностям гражданского общества: свободе, равенству, братству[9]. Исходя из этого, французская общеобразовательная школа, ее учебные программы продолжают уделять повышенное внимание греческой и римской цивилизациям, где в классических учебных заведениях на первое место в учебно-воспитательном процессе ставилось всестороннее гармоническое развитие личности[10]. При разработке содержания литературного образования ученые-педагоги больше ориентируют на моральные, чем на литературные ценности произведения[11]. Для развития у школьника вкуса и эстетической чувствительности большое внимание уделяется искусству. Должное овладение учащимся профессиональными первичными знаниями также рассматривается французской школой в качестве составной части общей культуры человека[12].

В настоящее время вопрос образования в области культуры стал одной из специфических ценностей школьного образовательного процесса. Он продолжает оставаться одним из фундаментальных вопросов французской педагогической мысли.

---

[1] *Chateau J.-Y.* La culture générale. Paris, 1960. P. 7.
[2] *Onimus J.* Mutations de la culture. Paris, 1973. P. 12.
[3] *Baillon R.* La bonne école. Paris, 1991. P. 77.
[4] *Lobrot M.* La pédagogie institutionelle. Paris, 1966. P. 24.
[5] *Baillon R.* La bonne école. P. 116.
[6] *Ibid.* P. 115.
[7] *Fauroux R.* Le combat de l'école. Paris, 1996. № 92. P. 8—20.
[8] *Hacquart G.* Vers une école idéal. Paris, 1971. P. 20.
[9] *Durand-Prinborgne.* L'éducation nationale. Une culture, un service, un systime. Paris, 1997. P. 60.
[10] *Гершунский Б. С.* Грамотность для XXI века // Сов. педагогика. 1980. № 4. С.13.
[11] *Prost A.* L'école entre l'Etat, la famille et l'enseignement. Paris // Projet. 1990. № 23, P.13.
[12] *Conivez P.* Eduquer le citoyen? Paris, 1995. P. 112.

***Т. Я. Кузняцова** (Мінск),*
*аспірантка Нацыянальнага інстытута адукацыі Рэспублікі Беларусь*

# КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ У ГУКАВОЙ СІСТЭМЕ МОВЫ І ЭЛЕМЕНТАХ ІНТАНАЦЫІ

Здольнасць да моўных зносін, да пазнання свету, здольнасць планаваць свае дзеянні фарміруецца ў малодшага школьніка па меры развіцця мозга, але ход самаго працэсу залежыць выключна ад практычнай трэніроўкі (у нашым выпадку — ад звычайнай моўнай дзейнасці). На этапе, калі для дзіцяці становіцца даступным засваенне мовы ў яго рэгулюючай функцыі (усведамленне дзецьмі слоў *нельга, еш, бяры, ідзі* і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

г. д.), можна разглядаць родную мову ў якасці аднаго з важнейшых сродкаў этычнага выхавання.

Пры засваенні роднай мовы малодшы школьнік вылучае ў чужым маўленні і выкарыстоўвае ў сваім толькі тыя сінтаксічныя канструкцыі, якія надзелены сэнсаваадрозніваль-най функцыяй. Так, у прыватнасці, дзіця засвойвае формы ветлівасці: *Падкажыце, калі ласка, дзе я магу знайсці такую кнігу? Дазвольце вам прадставіць свайго сябра. Віншую цябе з днём нараджэння.* Асэнсаванне малодшымі школьнікамі такіх слоў і паняццяў, як *добрай раніцы, добры дзень, добры вечар, прывітанне, бывайце здаровы, да пабачэння, усяго добрага, усяго найлепшага, да заўтра, да сустрэчы; клапатлівасць, сціпласць, вернасць, дабрыня,* стане прыватным выпадкам асновы праграмы па фарміраванні этычных прынцыпаў мовы. Тут важна засяродзіць увагу дзяцей не столькі на фармальным засваенні такіх слоў, а колькі на іх "прысваенні", гэта значыць на набходнасці іх выкарыстання ў жывым маўленні.

Камунікатыўны намер такіх сітуацый можа быць забяспечаны заданнямі на прачытванне мастацкіх тэкстаў і адказам на пытанні па іх; на складанне тэксту па пытаннях (малюнках, серыі малюнкаў, па тэме і г. д.) з заданнем выкарыстаць словы пэўнай групы. Карыснымі будуць практыкаванні на супастаўленне падобных сказаў тыпу: *Пазнаёмцеся, калі ласка, з маім сябрам. — Пазнаёмцеся з маім сябрам. Як цябе завуць? — Я хацеў бы з табой пазнаёміцца.* Дзеці разам з настаўнікам аналізуюць гэтыя прыклады і прыходзяць да высновы, што сэнсавая нагрузка сказаў (у парах) аднолькавая: у першым выпадку абодва сказы выяўляюць намер асобы пазнаёміць нас са сваім сябрам, у другім — асоба сама жадае пазнаёміцца з другой асобай. А вось формы выяўлення гэтых структурных адзінак розныя. Малодшым школьнікам важна зразумець, што ветлівыя словы, з'яўляючыся ўмовай "добрай" правільнай мовы адукаванага чалавека, дапамогуць хутчэй і дакладней забяспечыць свой пазнавальны намер (дзецям можна сказаць, што так прынята гаварыць).

Так званы "інстынкт дасягнення", які заключаецца ў неабходнасці пазнання, у новых уражаннях, з'яўляецца патрэбнасцю бясконцай. Яго неабмежаваны характар стымулюе і вызначае па меры ўскладнення і пашырэння кола камунікатыўных сітуацый і прадметнай дзейнасці развіццё пазнавальных здольнасцей, якія абслугоўваюцца моўнымі адзінкамі.

Камунікатыўныя сітуацыі, якія прапаноўваюць падручнікі па роднай мове (*падпішыце віншавальную паштоўку свайму сябру; вас паслалі ў магазін за пакупкамі; як вы вітаецеся* і г. д.), навучаць выказваць ацэнку рэальнасці з дапамогай лексічных і граматычных сродкаў, іх гукавога і графічнага афармлення.

Часта даводзіцца назіраць, як вучань і настаўнік выказваюць адну і тую ж думку, але ўжываюць пры гэтым розныя моўныя сродкі: настаўнік энергічней, чым у паўсядзённай размове, артыкулюе гукі мовы, гукакомплексы і выразна інтануе сказы, а вучань слухае і паўтарае, імітуе яго мову, імкнецца засвоіць моварухі (артыкуляцыю і мадуляцыю голасу) і зразумець сэнс моўных адзінак.

Валодаць культурай мовы — значыць не толькі разумець значэнне элементаў мовы, але і памятаць, як прынята імі карыстаца ў літаратурнай мове. Культура мовы малодшага школьніка будзе залежыць ад таго, наколькі развіта ў яго моўнае чуццё, іншымі словамі, наколькі поўна і дакладна дзіця можа арыентавацца ў моўных адзінках, іх спецыфічных асаблівасцях і ўласцівасцях.

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ

Так як моўнае чуццё закранае лексічны, фанетычны і граматычны бакі мовы, то важна правільна выбраць адзіна магчымую ў дадзенай моўнай сітуацыі адзінку (граматычную, лексічную, фанетычную). Выбар моўнага элемента (тэксту, сказа, слова, гуку) павінен адпавядаць адэкватнасці сітуацыі моўных зносін. Так, напрыклад, пара слоў-сінонімаў *спаць — дрыхнуць* адрозніваецца па сваім стылявым праднакіраванні і таму не можа быць абсалютна тоеснай. Або другі прыклад. У якіх выпадках і якім асобам мы гаворым: Добры дзень! Салют! Добрай раніцы! Да пабачэння! Зразумела, што няма такой сітуацыі, у якой было б усё роўна як сказаць, якое слова (сказ) выкарыстаць. Таму практычнае навучанне правільнаму ўспрыманню і ўжыванню элементаў мовы ў пачатковых класах у многім будзе забяспечвацца граматычнай, лексічнай і фанетычнай сінаніміяй мовы. Такая стылістычная дыферэнцыяцыя дазволіць выказаць адну думку некалькімі сінтаксічнымі адзінкамі, прычым адна з іх будзе найбольш удала раскрываць камунікатыўную задумку тэксту. *(Увосень адлятаюць у вырай буслы. — У верасні буслы адляцелі ў цеплыя краіны.)* Можна паведаміць пра летнія канікулы ў форме дыялога, тэкста-разважання, тэкста-апавядання; сярод слоў-сінонімаў выбраць адзіна неабходнае ў данай сітуацыі моўных зносін *(дом — жыллё — вугал — хата — кватэра)*; улічваючы сэнсаадрознівальную функцыю гуку, правільна скласці гукакомплекс і надзяліць яго значэннем і г. д.

Падкрэслім асаблівую важнасць удасканалення вымаўленчай культуры мовы настаўніка, якая тлумачыцца тым фактам, што школьнікам гукавая культура (а як вынік і іншыя граматычныя навыкі) прывіваецца прамым шляхам пераймання. Безумоўна, што затым ажыццяўляецца асведамленне і аналіз засвоенай моўнай матэрыі, моўнай з'явы (успомнім натуральны шлях засваення мовы) у ходзе тэарэтычнага і практычнага навучаня. Але на першасным этапе праходзіць несвядомае засваенне адзінак мовы. Правільная мова настаўніка (у першую чаргу мова мастацкіх твораў-пацешак, калыханак, апавяданняў, лічылак, загадак, скарагаворак, забаўлянак, прыгаворак, песень, казак, вершаў) павінна стаць тым матэрыялам, на якім пазней будзе ўзводзіцца фундамент моўнай сістэмы. Дарэчы, аб існаванні такой сістэмы ў дзіцяці пісалі многія навукоўцы (Л. С. Выгоцкі, Д. Б. Эльконін, А. М. Шахнаровіч і інш.). Яе асаблівасцю з'яўляюцца дзве наступныя рысы: яна адрозніваецца ад моўнай сістэмы дарослага чалавека, але, безумоўна, з'яўляецца дзейнаснай, бо: 1) валодае пэўнымі заканамернасцямі; 2) дзіця можа выяўляць сам факт парушэння гэтых заканамернасцей; 3) дзіця можа аперыраваць незнаёмым матэрыялам.

Такім чынам, малодшыя школьнікі могуць усведамляць і аналізаваць сваю мову ў працэсе навучання на матэрыяле **ўжо засвоенай** імі папярэдне несвядомай моўнай сістэмы.

Гукавая сістэма беларускай мовы, як і любая іншая, мае свае спецыфічныя рысы, якія робяць яе непадобнай на астатнія мовы.

Навучыць школьнікаў атаясамліваць гукі ў розных моўных сітуацыях і праяўленнях, стварыць умовы для ўсведамлення сэнсаваадрознівальнай функцыі гукаў у мове можна прапанаваўшы наступныя заданні: 1) пераўтварыце адно слова ў другое, змяняючы на кожным этапе толькі адзін гук *(бант — рант — рана — раса — каса — каза,* або *суп — сук — лук — гук — гул — гол — кол — кок — рок — рак)*. Звяртаецца ўвага дзяцей на тое, што пры нязначным змяненні формы сло-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ва (замены аднаго гуку) значна змяняецца сэнс усяго слова; 2) устаўце прапушчаныя словы ў сказах: *Успаміны (лета) яшчэ доўга захаваюцца ў нашай памяці. Маленькі блакітны караблік плыў (вада).*

Веданне анатоміі (алгарытму артыкуляцыі) гукаў садзейнічае правільнаму і дакладнаму іх вымаўленню, паказвае іх істотныя прыметы.

Так як гукі з'яўляюцца будаўнічым матэрыялам для слоў, сказаў і, як вынік, тэкстаў, то, зразумела, што іх усведамленне разам з элементамі інтанацыі будзе прадвызначаць выпрацоўку чуткасці да інтанацыйнай і эмацыянальнай афарбоўкі сваёй думкі з захаваннем патрабаванняў логікі і стылістыкі. Напрыклад, розніцу вышыні тону, націскны склад можна паказаць даволі лёгка, параўнаўшы інтанацыю двух сказаў: *Да. Да?* А што датычыцца тэмбру голасу, то ён не паддаецца апісанню; тут можна прапанаваць дзецям вымаўляць адно і тое ж слова (сказ, тэкст) у розных сітуацыях (са смуткам, з болем, з радасцю, спяшаючыся і г. д.) Напрыклад, прачытайце верш з радасцю; як быццам вас напалохалі, пакрыўдзілі, раззлавалі; з гонарам і г. д.

**Сырадой**

Ходзяць унукі чарадой  
Піць бабулін сырадой.  
Кажа ім карова: "Му-у-у!  
Я з вас грошай не вазьму".

Вопыт нашых назіранняў паказвае, што дзеці без праблем засвойваюць прасадэмы нават без навучання. Практыкаванні ж ў мадуляцыі голасу па тэмбры праводзяцца пераважна ў працэсе развучвання дзецьмі вершаў (з пачуцём радасці, смутку, насмешлівасці, надзеі і г. д.), пры чытанні мастацкіх твораў па ролях. Можна прапанаваць нават адно слова (*падыдзі, цішыня* і інш.) для вымаўлення з асобым тэмбрам.

На фоне закончаных інтанацый сказа (пытальнай, апавядальнай, пабуджальнай) можна паказаць лагічны націск і трэніраваць незакончаныя інтанацыі: пералічэнне, супрацьпастаўленне, перасцярога і інш. Выразна прачытайце тэкст з улікам знакаў прыпынку і аднародных членаў сказа: *Родны край! ты заўсёды ў маім сэрцы. Я люблю твае прасторы, /гарады,/ вёскі. Я ўдыхаю пахі духмянага сена і чабору. І ўсё люба, /дорага мне на зямлі маіх бацькоў. (Паводле Т. Хадкевіча)*

Тэмп маўлення, яго змяненне могуць мець граматычнае значэнне (у хуткім маўленні вымаўляюцца пабочныя словы). Але часцей за ўсё тэмп мовы ўказвае на эмацыянальны стан гаворачага: з улікам прасадэм, камунікацыйнага намеру, лагічнага націску, закончанай і незакончанай інтанацыі.

Малодшыя школьнікі засвойваюць інтанацыйныя малюнкі сказаў розных канструкцый; ім нават не трэба растлумачваць асаблівасці прасадэм. Дзецям неабходна праслухаць тую ці іншую інтанацыю і запомніць яе. Прасцей кажучы, школьнікі засвойваюць інтанацыю несвядома, шляхам пераймання, разам з лексічным і граматычным зместам узораў. Моўнае чуццё прадугледжвае лёгкі перанос выпрацаваных навыкаў на іншы, незнаёмы матэрыял, таму на аснове нашых назіранняў можна заўважыць, што дзеці перанясуць інтанацыю ўсвядомленага ўзору на любую падобную адзінку роднай мовы.

Работа па фарміраванні гукавой культуры мовы арганізуецца ў працэсе школьнага навучання з улікам наступных задач: 1) падабраць мэтазгодны матэрыял у якасці моўнага ўзору; 2) неабходна вучыць дзяцей правільнаму вымаўленню сказа (тэксту) данай канструкцыі; 3) зацікавіць вучняў выбраным тэкстам (забяспечыць камунікатыўны намер); 4) неабходна арганізаваць далейшую работу па замацаванні ведаў. Такія стра-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

тэгічныя задачы могуць быць пастаўлены пры вывучэнні як граматыкі, так і лексікі ў пачатковай школе. Напрыклад, заданне на фарміраванне інтанацыйнага слыху і навыкаў правільнага вымаўлення ў пачатковай школе можа выглядаць так: складзіце сказы па малюнках; ілюстрацыях; на аснове прачытанага ці праслуханага з заданнем перадаць смутак, весялосць. гора і г.д.; прачытайце тэкст са спецыяльным заданнем, зрабіце адпаведныя паўзы; вызначце лагічны націск; вымавіце ціха, гучна, павольна.

Важнае месца ў сістэме выпрацоўкі чуткасці да слова належыць назіранням, якія накіраваны на раскрыццё значэння слова і ўстойлівых спалучэнняў. Значыць, каб сфарміраваць выразнасць мовы, дзеці павінны арыентавацца ў сінонімах, антонімах, эпітэтах, фразеалагізмах. Для таго, каб аперыраваць, напрыклад, сінонімамі, трэба добра разбірацца ў іх адценнях.

Вядома, што прадмет уваходзіць у свядомасць дзіцяці праз пяць пачуццяў: зрок, слых, нюх, дотык і смак. Настаўніку варта задзейнічаць як магчыма большую групу пачуццёвых аналізатараў для паспяховага "прысваення" адзінкі дзіцем (усебаковае выкарыстанне нагляднасці).

Пры знаёмстве з моўнымі адзінкамі настаўніку (або вучням) неабходна прытрымлівацца некаторых правілаў вымаўлення: 1) трэба гаварыць дастаткова гучна; 2) адзінкі вымаўляць дакладна, гэта значыць энергічна і правільна артыкуляваць іх; 3) прытрымлівацца правіл арфаэпіі, пазбягаючы ненатуральнага вымаўлення; выкарыстоўваць слова так, каб паказаць яго разнастайныя граматычныя формы.

Разам з тым у малодшых школьнікаў будзе развівацца і граматычны аспект моўнага чуцця. Наш вопыт і назіранні паказалі, што калі спецыяльнымі практыкаваннямі растлумачыць (дапамагчы асэнсаваць) дзецям марфалагічную структуру слова, то эффект словатворчасці, апісаны К. І. Чукоўскім (*чыстата — брудната, настаўнік — думальнік*), амаль знікае; у мове малодшага школьніка назіраюцца пераважна словы нарміраванай літаратурнай мовы; развіваюцца здольнасці да абстрагіравання (ма***ленькі***, ні***зенькі***; ляс***нік***, садоў***нік***, настаў***нік*** і г. д.).

Добрым матэрыялам пры развіцці моўнага чуцця з'яўляецца засваенне асаблівасцей антонімаў. Вядома, што для параўнання розных асоб, прадметаў трэба суадносіць іх прыметы, супрацьлеглыя па значэнні. У сувязі з гэтым магчыма такое заданне: Знайдзіце памылкі і выпраўце іх: *На талерцы было два яблыкі: адзін быў зялёны, а другі — кіслы. / Было ў бацькі два сыны. Старэйшы быў разумны і талковы, усё ў яго атрымлівалася, а малодшы — дурань: нічога не разумеў. / У мяне сабака вялікі і разумны, а ў цябе — маленькі і непрыгожы.*

Адзначым, што без папярэдняга засваення мінімальнай колькасці слоў і элементарнага ўмення артыкуляваць гукі і мадуляваць інтанацыю сказа граматычныя практыкаванні праводзіць немагчыма. Менавіта таму ўзбагачэнне мовы граматычнымі формамі ажыццяўляецца ў працэсе пашырэння слоўніка і развіцця фанетычных навыкаў.

Работа, арганізаваная па засваенні і ўсведамленні сінонімаў, антонімаў, амонімаў і фразеалагізмаў, павінна ўлічваць той факт, што слова, з'яўляючыся сродкам абстракцыі і абагульнення, заўсёды мае свой канкрэтны, уласны сэнс, калі яно актуалізуецца ў мове; задача настаўніка — указаць на гэтую рознасць у семантыцы слоў дзецям і такім чынам наладзіць умовы для развіцця "добрага" правільнага вуснага маўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ